

РАЗДЗЕЛ III

# БССР У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ

## § 11. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР

***Успомніце.*** Узгадайце наступствы Першай сусветнай вайны і Рыжскага міру для насельніцтва Беларусі.

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, як паўплывалі на беларускую нацыянальную дзяржаўнасць гістарычныя падзеі, звязаныя з уз'яднаннем Заходняй Беларусі і БССР.

**Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.** Ва ўмовах узрастання пагрозы вайны з боку Германіі савецкае кіраўніцтва праводзіла палітыку калектыўнай бяспекі і праяўляла гатоўнасць супрацоўнічаць з Вялікабрытаніяй і Францыяй. Аднак брытанскі і французскі ўрады прытрымліваліся ў дачыненні Германіі палітыкі «прымірэння» з агрэсарам. Таму савецкае кіраўніцтва пайшло на заключэнне з Германіяй дагавора аб ненападзе 23 жніўня 1939 г. Ён быў падпісаны ў Маскве па ініцыятыве германскага боку і ўвайшоў у гісторыю пад назвай «пакт Рыбентропа — Молатава», па прозвішчах міністраў замежных спраў Германіі і СССР. Дакумент дазволіў Савецкаму Саюзу атрымаць гарантыі бяспекі і выйграць няхай кароткі, але так неабходны для падрыхтоўкі ўзброеных сіл да вайны час. Пакт быў дапоўнены сакрэтным протаколам, у адпаведнасці з якім тэрыторыі Польшчы і шэрагу іншых краін падзяляліся на сферы ўплыву СССР і Германіі. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна прызнаваліся «сферай інтарэсаў» СССР.

№ 7

**1 верасня 1939 г.** нацысцкая Германія напала на Польшчу. Распачалася Другая сусветная вайна. Маючы велізарную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, германскія войскі акупавалі значныя тэрыторыі Польшчы, у склад якой па ўмовах Рыжскага міру ўваходзіла Заходняя Беларусь. Былі заняты некаторыя заходнебеларускія населеныя пункты, у тым ліку горад Брэст. У складзе польскага гарнізона, які абараняў Брэсцкую крэпасць у верасні 1939 г., было шмат беларусаў, прызваных у польскае войска. Крэпасць была захоплена толькі пасля некалькіх штурмаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ва ўмовах наступлення германскіх войскаў па тэрыторыі Польшчы кіраўніцтва СССР прыняло рашэнне, згодна з якім часці Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу. Гэта падзея атрымала ў гісторыі назву **паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь**. Паход пачаўся раніцай **17 верасня 1939 г.** і быў сустрэты савецкімі людзьмі з адабрэннем.

> У загадзе часцям Чырвонай Арміі было забаронена бамбіць і абстрэльваць з гармат населеныя пункты. Ад іх патрабавалася з павагай ставіцца да польскіх вайскоўцаў, калі тыя не будуць аказваць узброенага супраціўлення. У загадзе польскім войскам адзначалася: «З Саветамі не ваяваць, толькі ў выпадку націску з іх боку ці спроб раззбраення нашых часцей… Войскі, да якіх падышлі Саветы, павінны ўступаць з імі ў перагаворы…»

Асноўная частка насельніцтва Заходняй Беларусі — сяляне, рабочыя, рамеснікі, інтэлігенцыя — сустракала Чырвоную Армію як вызваліцельніцу, нярэдка з кветкамі ў руках і хлебам-соллю. Мясцовыя жыхары звязвалі з яе прыходам спадзяванні на спыненне вайны і вяртанне дадому прызваных у польскую армію землякоў.

Да 25 верасня войскі Чырвонай Арміі поўнасцю занялі Заходнюю Беларусь. Дагаворам аб дружбе і граніцы паміж Савецкім Саюзам і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. была замацавана новая мяжа.




Карта БССР, размешчаная ў газеце «Звязда» за 1940 г.

**?** *Папрацуйце з ілюстрацыяй, выкарыстоўваючы метад загадкавай карцінкі. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Сучасныя беларускія гісторыкі лічаць, што ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, якое адбылося ў выніку паходу Чырвонай Арміі, дазволіла аднавіць гістарычную справядлівасць у дачыненні да падзеленай дзяржаўнымі межамі беларускай нацыі. Гэта дало беларусам магчымасць жыць і працаваць разам ва ўмовах савецкага грамадства і спыніла паланізацыю часткі беларускага народа.

У выніку ўз'яднання з Заходняй Беларуссю тэрыторыя БССР павялічылася са 125,5 тыс. км$^2$ да 225,7 тыс. км$^2$. Колькасць насельніцтва вырасла прыкладна ў два разы і ў канцы 1940 г. склала больш за 10 млн чалавек (**).

**Усталяванне савецкай улады ў Заходняй Беларусі.** Пасля таго як Чырвоная Армія заняла Заходнюю Беларусь, тут пачалося ўсталяванне савецкага ладу. Дзейнасць усіх палітычных партый, акрамя Камуністычнай, была забаронена.

22 кастрычніка 1939 г. прайшлі выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі. Ён адбыўся ў Беластоку 28—30 кастрычніка 1939 г. Дэпутаты прынялі Дэкларацыю аб усталяванні савецкай улады ў Заходняй Беларусі і рэзалюцыю «Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР». Таксама было вырашана канфіскаваць (прымусова адабраць) памешчыцкія землі,



Прэзідыум Народнага сходу Заходняй Беларусі. На пярэднім плане — першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка




Сяляне вёскі Калодна Беластоцкага ваяводства ў дзень выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі. 22 кастрычніка 1939 г.

**?** *Папрацуйце з фотаздымкам, выкарыстоўваючы прыём загадкавай карцінкі. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

нацыяналізаваць (перадаць з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную) банкі і буйну́ю прамысловасць.

Дэпутаты Народнага сходу звярнуліся ў Вярхоўны Савет СССР з просьбай аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза і ўз'яднанні яе з БССР. **2 лістапада 1939 г.** гэта просьба была задаволена Вярхоўным Саветам СССР, а **14 лістапада 1939 г.** — Вярхоўным Саветам БССР.

**Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.** Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у жыцці заходнебеларускага насельніцтва адбываліся змены. На далучаных тэрыторыях рэканструяваліся старыя і будаваліся новыя прадпрыемствы. Павялічыўся аб'ём прадукцыі мясцовай прамысловасці. Было ліквідавана беспрацоўе, адчынена шмат школ, бібліятэк, клубаў. Навучанне ў школах пераводзілася на беларускую мову. Разгарнулася падрыхтоўка новых спецыялістаў. Уводзілася бясплатнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва.

№ 8

У вёсцы памешчыцкія землі размяркоўваліся паміж сялянамі. У калгасы былі аб'яднаны 30 тыс. сялянскіх двароў. Пераважная большасць жыхароў вёскі падтрымала ідэю калектывізацыі, аднак у заможных яна вы́клікала супраціўленне. Іх пакуль не раскулачвалі, а пакідалі столькі зямлі, колькі іх сем'і маглі апрацаваць уласнымі сіламі.

10 кастрычніка 1939 г. савецкае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб перадачы Вільні і Віленскага краю Літве. Наконт гэтай падзеі народны камісар замежных спраў СССР В. М. Молатаў адзначыў: «Савецкі Саюз пайшоў на перадачу Вільні Літоўскай рэспубліцы не таму, што ў ёй пераважае літоўскае насельніцтва. Не, у Вільні большасць складае нелітоўскае насельніцтва. Але савецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільня... павінен належаць Літве як такі горад, з якім звязаны, з аднаго боку, гістарычнае мінулае Літоўскай дзяржавы, а з другога — нацыянальныя спадзяванні літоўскага народа».

*Параўнайце заходнюю мяжу БССР па стане на 1939 г. і «лінію Керзана», прапанаваную ў 1919 г., з апорай на картасхемы на першым і другім форзацах вучэбнага дапаможніка. Зрабіце выснову аб фарміраванні тэрыторыі БССР.*

Такім чынам, уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР мела станоўчае значэнне для ўз'яднання беларускай нацыі. Гэта падзея стала чарговым этапам у працэсе афармлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

***Новыя паняцці і тэрміны**: паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

** Янка Купала адгукнуўся на ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР наступнымі паэтычнымі радкамі:

*Ты з Заходняй, я з Усходняй*
*Нашай Беларусі,*
*Больш з табою ўжо ніколі*
*Я не разлучуся…*

*Разам будзем араць поле*
*Трактарам сталёвым,*
*Сеяць жыта і пшаніцу*
*На загонах новых.*

***1.*** *Ахарактарызуйце пачуцці, перададзеныя ў вершы*
***2.*** *Згадайце наступствы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, апісаныя ў вершы.*

**1.** Ахарактарызуйце знешнепалітычныя ўмовы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.
**2.** Як паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь тлумачыцца сучаснымі беларускімі гісторыкамі?
**3.** Пералічыце новыя з'явы ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці заходнебеларускага насельніцтва пасля ўз'яднання з БССР.
**4.** Уявіце сябе ў ролі гарадскога ці сельскага жыхара тагачаснай Заходняй Беларусі. Як бы вы паставіліся да падзей восені 1939 г.? Свой адказ растлумачце. Выкарыстайце метадычную параду «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179 вучэбнага дапаможніка.
**5.** Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР: аднаўленне гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да беларускага народа на фоне еўрапейскай палітыкі» і прэзентуйце яго на ўроку абагульнення па раздзеле III.

## § 12. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

***Успомніце.*** **1.** Калі і якім чынам пачалася Другая сусветная вайна?
**2.** Што адбывалася з Брэсцкай крэпасцю ў верасні 1939 г.?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, у чым заключаўся патрыятызм удзельнікаў абарончых баёў у Беларусі.

**Напад нацысцкай Германіі на СССР.** На досвітку **22 чэрвеня 1941 г.** гітлераўскія войскі вераломна ўварваліся ў межы Савецкага Саюза. Пачалася **Вялікая Айчынная вайна**, якая стала складнікам Другой сусветнай вайны. Галоўнымі мэтамі нацысцкай Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза былі пашырэнне жыццёвай прасторы для германскай нацыі за кошт далучэння ўсходніх тэрыторый, знішчэнне савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу, анямечванне насельніцтва і фізічнае вынішчэнне значнай яго часткі.

У адпаведнасці з **планам «Барбароса»** (названы па імені германскага караля і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі, удзельніка крыжовых паходаў у XII ст.) Гітлер ставіў стратэгічную задачу разграміць Савецкі Саюз у «маланкавай вайне» — хуткацечнай ваеннай кампаніі. Пры гэтым гітлераўскае камандаванне надавала асаблівае значэнне

Правообладатель Издательский центр БГУ